Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!
Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА
І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

59 (7385)
СУБОТА
31
сакавіка 1945 г.

Цана 20 кап.

Учора доблесныя войскі Чырвонай Арміі дабіліся новых бліскучых перамог.

Войскі 2-га Украінскага фронта фарсіравалі рэкі Грон і Нітра і авалодалі радам моцных апорных пунктаў абароны немцаў на Браціслаўскім напрамку.

Войскі 3-га Украінскага фронта авалодалі гарадамі Залаэгерсег і Кестэль, а таксама радам моцных апорных пунктаў перад нафтавым раёнам Надзьканіжа.

Войскі 2-га Беларускага фронта завяршылі разгром данцыгскай групы немцаў і штурмам авалодалі горадам і крэпасцю Гданьск (Данцыг).

Слава нашай гераічнай Чырвонай Арміі!

ЗАГАД

Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

Камандуючаму войскамі 2-га Украінскага фронта
Маршалу Совецкага Саюза МАЛІНОЎСКАМУ
Начальніку штаба фронта **генерал-палкоўніку ЗАХАРАВУ**

Войскі 2-га УКРАІНСКАГА фронта, перайшоўшы ў наступленне, фарсіравалі рэкі ГРОН і НІТРА, прарвалі абарону праціўніка па заходніх берагах гэтых рэк і, прасунуўшыся перад на 50 кілометраў, авалодалі гарадамі КАМАРНО, НОВЫ ЗАМКІ, ШУРАНЫ, КОМ'ЯТЫЦЭ, ВРАБЛЕ—моцнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на Браціслаўскім напрамку.

У баях пры прарыве абароны немцаў і авалоданні КАМАРНО, НОВЫ ЗАМКІ і другімі названымі гарадамі вызначыліся войскі генерал-палкоўніка ШУМІЛАВА, генерал-лейтэнанта МАНАГАРАВА, генерал-лейтэнанта ПЕТРУШЭЎСКАГА, генерал-маёра ЛУКІНА, генерал-маёра ЯКАЎЛЕВА, генерал-маёра БІРМАНА, генерал-маёра АЛЁХІНА, генерал-маёра КРУЗЕ, генерал-маёра ОСТАШЭНКА, генерал-маёра ЕРЭНЦЬЕВА, генерал-лейтэнанта САФІУЛІНА, генерал-маёра ГРЫГАРОВІЧА, генерал-маёра МАЛАЖАЕВА, генерал-маёра КАРПУХІНА, генерал-маёра СМІРНОВА, генерал-маёра ОСЕВА, генерал-маёра ОГАРОДАВА, генерал-маёра ЗДАНОВІЧА, генерал-маёра ПРЭАБРАЖЭНСКАГА, генерал-маёра АРБАЧОВА, генерал-маёра ГРЭЧАНАГА, генерал-маёра СІНА, палкоўніка СОБАЛЕВА, палкоўніка МАРОЛЬ, палкоўніка ПАНАВА, палкоўніка ЕРОМІНА, палкоўніка САЛЫЧЭВА, палкоўніка ОРЛОВА, палкоўніка ПЕРЭМАНАВА, палкоўніка СМІРНОВА, маёра БЫСТРОВА; кавалерысты генерал-лейтэнанта ПЛІЕВА, генерал-лейтэнанта СОКАЛАВА, генерал-маёра ПІЧУГІНА, генерал-маёра ГАЛОЎСКАГА, генерал-маёра БЕЛАУСА, генерал-маёра ШМУЙЛО, генерал-маёра ГРУСТАЛЁВА, генерал-маёра ПАЎЛАВА, палкоўніка ГАГУА, палкоўніка РЭВА; маракі контр-адмірала ХАЛАСЦЯКОВА, капітана I ранга СВЕРДЛАВА, капітана II ранга АРЖАЎНА, капітана II ранга ДЗЕРЖАВІНА, капітан-лейтэнанта ЛАВІЦКАГА, маёра ПАСМУРАВА; артылерысты генерал-палкоўніка артылерыі ФАМІНА, генерал-лейтэнанта артылерыі КУМЕЛАНА, генерал-лейтэнанта артылерыі ДЗЕРЭША, генерал-лейтэнанта артылерыі ПЕТРОВА, генерал-маёра артылерыі ШМАКАВА, генерал-маёра артылерыі ЗЫКАВА, генерал-маёра артылерыі ПАПОВІЧА, палкоўніка МАРЧЭНКА, палкоўніка МАКАРАВА, палкоўніка НЕКРАСАВА, палкоўніка ГУШЧЫНА, палкоўніка АДАШЭВА, палкоўніка ПАСТУХА, палкоўніка БАГУШЭВІЧА, палкоўніка ВЛАДЗІМІРАВА, палкоўніка ЛЮБІМАВА, палкоўніка ШУБНОГА, палкоўніка КЛЕЙМАНАВА, маёра ЛЯМЗІНСКАГА, маёра КАСТЫЛЁВА, палкоўніка ПАЎЛІКА, палкоўніка КАЗАРЭНКА, палкоўніка КІСЛОГА, палкоўніка ДЗЕНІСЕНКАВА, палкоўніка ТРОНЕВА, палкоўніка САМЧЭНКА, палкоўніка ЛЕОНЦЬЕВА, маёра РАЖЭМАНАВА, падпалкоўніка ПАПЛЫКА, падпалкоўніка ЕЎЛІНА, маёра ПАДАПРЫГОРА, маёра БАРХАТАВА; танкісты генерал-палкоўніка танкавых войск КУРКІНА, генерал-маёра танкавых войск БАГДАНАВА, палкоўніка СУПЯНА, падпалкоўніка ЛЕЙБМАНА, палкоўніка БРЫЖЫНЁВА, падпалкоўніка АНТОНАВА, маёра ТУРЧЫНА, маёра СЕЎРУКОВА, маёра БЕЛАУСАВА, маёра ГАПОНЕНКА, падпалкоўніка ПАДЛЕСНАГА, падпалкоўніка ШАЛК, падпалкоўніка МАРОЗ, палкоўніка ГАНЧАРУКА; лётчыкі генерал-палкоўніка авіяцыі ГАРУНОВА, генерал-лейтэнанта авіяцыі СЕЛЕЗНЁВА, генерал-лейтэнанта авіяцыі СЦЕПІЧЭВА, генерал-маёра авіяцыі КАМАНІНА, генерал-лейтэнанта авіяцыі ПАДГОРНАГА, палкоўніка РУБЭ, палкоўніка ЧАНПАЛАВА, палкоўніка ЧЫЖЫКАВА, палкоўніка ШУЦЕЕВА, палкоўніка ТАРАНЕНКА, палкоўніка ЮДАНОВА, падпалкоўніка ЕРОМЕНКА, палкоўніка САПРЫКІНА, палкоўніка КЛОБУКАВА, палкоўніка СЕМЕНЕНКА, палкоўніка ЛАЗЕНКА, падпалкоўніка БЕРМАНА, маёра БАЛАБАНА; сапёры генерал-лейтэнанта інжынерных войск ЦЫРЛІНА, генерал-маёра інжынерных войск ТУПЧЭВА, генерал-маёра інжынерных войск ПЛЯСКІНА, генерал-маёра інжынерных войск ВАСІЛЬЕВА, генерал-маёра інжынерных войск ТЮЛЕВА, падпалкоўніка БАДАЕВА, палкоўніка ІСАЕВА, палкоўніка ЦЭПЕНЮК, палкоўніка НАСОНАВА, падпалкоўніка АНЗАУРАВА, палкоўніка МЯСНІКОВА; сувязісты генерал-лейтэнанта войск сувязі ЛЕОНАВА, палкоўніка МАКАРЭНКА, палкоўніка БАРЫСЕНКА, маёра ШЫШЭЛАВА, маёра ВАЛЧУКОВА, маёра СОКАЛАВА, палкоўніка дзяржаўнай бяспекі КАРПАВА.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях пры прарыве абароны немцаў і авалоданні КАМАРНО, НОВЫ ЗАМКІ і другімі названымі гарадамі, прадставіць да ўзнагароджання ордэнамі.

Сёння, 30 сакавіка, у 20 гадзін сталіца нашай Радзімы МАСКВА ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 2-га УКРАІНСКАГА фронта, якія прарвалі абарону немцаў і авалодалі названымі гарадамі,—дваццаццю артылерыйскімі залпамі з двухсот дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні АБ'ЯЎЛЯЮ ПАДЗЯКУ кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях пры прарыве абароны немцаў і вызваленні пайменаваных гарадоў.

Вечная слава героям, паўшым у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захопнікам!

30 сакавіка 1945 года.
№ 318

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН.

ЗАГАД

Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

Камандуючаму войскамі 2-га Беларускага фронта
Маршалу Совецкага Саюза РАКАСОЎСКАМУ
Начальніку штаба фронта **генерал-палкоўніку БАГАЛЮБАВУ**

Войскі 2-га БЕЛАРУСКАГА фронта завяршылі разгром данцыгскай групы немцаў і сёння, 30 сакавіка, штурмам авалодалі горадам і крэпасцю ГДАНЬСК (ДАНЦЫГ)—важнейшым портам і першакласнай ваенна-марской базай немцаў на Балтыйскім моры.

Над ГДАНЬСКАМ узнят нацыянальны флаг ПОЛЬСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ.

У баях за горад ГДАНЬСК войскі фронта ўзялі ў палон 1.000 нямецкіх салдат і афіцэраў, а таксама захапілі танкаў і самаходных гармат 140, палявых гармат 358, падводных лодак 45 і многа другога ўзбраення і ваеннай маёмасці.

У баях за авалоданне горадам і крэпасцю ГДАНЬСК вызначыліся войскі генерал-палкоўніка ФЕДЗЮНІНСКАГА, генерал-палкоўніка БАТАВА, генерал-палкоўніка ГРЫШЫНА, генерал-палкоўніка ПАПОВА, генерал-лейтэнанта КОКАРЭВА, генерал-лейтэнанта БАБКОВА, генерал-маёра КІНАСЯНА, палкоўніка ПЕНЧЭЎСКАГА, генерал-маёра ХАБАРАВА, генерал-лейтэнанта АНІСІМАВА, генерал-лейтэнанта ПАЛЕНАВА, генерал-маёра ФЕЦІСАВА, генерал-маёра ЧУВАКОВА, генерал-лейтэнанта ЭРАСТАВА, генерал-лейтэнанта АЛЕКСЕЕВА, генерал-лейтэнанта ТЕРЭНЦЬЕВА, генерал-маёра СМІРНОВА, генерал-лейтэнанта ДРАТВІНА, генерал-лейтэнанта РАБЫЗВА, палкоўніка СОННІКАВА, генерал-маёра ЯКУШЭВА, палкоўніка КУРЭНЯ, генерал-маёра БАРШЧОВА, генерал-маёра ЛЯШЧЭНКА, генерал-маёра ДЗЕВІДАВА, палкоўніка ІСНАКОВА, генерал-маёра КАЛЧАНАВА, генерал-маёра ЗЕБЕННІКА, генерал-маёра РАХІМАВА, генерал-маёра МАРАВА, генерал-маёра ТЕРЭМАВА, палкоўніка ВЕЛІЧКА, генерал-маёра БАРЫСАВА, генерал-маёра ДЖАНДЖГАВА, палкоўніка АФАНАСЬЕВА, генерал-маёра КІРЫЛАВА, генерал-маёра КРАСНАШТАНАВА, генерал-маёра СУПРУНОВА, палкоўніка ПАЧКОВА, генерал-маёра КАНАНЕНКА, палкоўніка ГРЫЧЭВА, палкоўніка ШЭПЕЛЬ, генерал-маёра ГУСЕВА, палкоўніка МЕЛЬДЗЕРА, палкоўніка КАРПЕЛЮКА, генерал-маёра КІРСАНАВА, генерал-маёра ТІМАФЕЕВА, палкоўніка МУРАДАЛЮБАВА, палкоўніка БЕЛЯЕВА, палкоўніка МУРАВА, падпалкоўніка МЕЛЬНІКАВА; артылерысты генерал-палкоўніка артылерыі САКОЛЬСКАГА, генерал-лейтэнанта артылерыі ДЗЕГЦЯРОВА, генерал-маёра артылерыі КАРЭНА, генерал-маёра артылерыі КАЗАКОВА, генерал-маёра артылерыі ДЗМІТРЫЕВА, генерал-маёра артылерыі РАЗІНОВА, генерал-лейтэнанта артылерыі БЕСКІНА, генерал-маёра артылерыі ПЯДУСАВА, генерал-маёра артылерыі РАЗІНА, генерал-маёра артылерыі МАЛАФЕЕВА, палкоўніка ІДЗІНА, палкоўніка ШЛЁПІНА, палкоўніка АКІМУШКІНА, палкоўніка ЛЕОНАВА, палкоўніка БАРМОЦІНА, палкоўніка ГОРЫНА, палкоўніка МАЛЯЎСКАГА, палкоўніка РЫБКІНА, палкоўніка ВАСІЛЕНКА, палкоўніка СУКАЧОВА, палкоўніка ГАРАЛЁВА, палкоўніка СУХУШЫНА, палкоўніка ДЗЕГЦЯРЭНКА, палкоўніка ВОЛКАВА, палкоўніка НЕСВЕТАЙЛА, палкоўніка КАРОТКІХ, генерал-маёра артылерыі ПЕТРОВА, палкоўніка КАМІНСКАГА, палкоўніка ДРАБКОВА; танкісты генерал-лейтэнанта танкавых войск ЧЭРНЯЎСКАГА, генерал-маёра танкавых войск ПАНАВА, генерал-лейтэнанта танкавых войск ПАНФІЛАВА, генерал-лейтэнанта танкавых войск ПАПОВА, генерал-маёра танкавых войск ФІРСОВІЧА, палкоўніка МІРАНОВІЧА, генерал-маёра танкавых войск НОВАК, танкісты Першай Польскай арміі генерал-лейтэнанта ПАПЛАЎСКАГА, генерал-маёра танкавых войск ПЕТРУШЫНА, палкоўніка ЮДЗІНА, палкоўніка МАЛЮЦІНА, генерал-маёра танкавых войск МАЛЫШЭВА, палкоўніка ІГОНІНА; лётчыкі генерал-палкоўніка авіяцыі ВЕРШЫНІНА, Галоўнага Маршала авіяцыі ГАЛАВАНАВА, генерал-палкоўніка авіяцыі САМОХІНА, генерал-маёра авіяцыі АЛЕКСЕЕВА, генерал-лейтэнанта авіяцыі ПЕРМІНАВА, генерал-лейтэнанта авіяцыі БАЙДУКОВА, генерал-лейтэнанта авіяцыі ОСІПЕНКА, генерал-маёра авіяцыі БАРЫСЕНКА, генерал-лейтэнанта авіяцыі ТУПІКАВА, генерал-лейтэнанта авіяцыі ЛОГІНАВА, генерал-лейтэнанта авіяцыі НЕСЦЕРЦЭВА, генерал-лейтэнанта авіяцыі СЧОТЧЫКАВА, генерал-маёра авіяцыі ГЕЦЬМАНА, палкоўніка ВОЛКАВА, палкоўніка ВУС, палкоўніка ОСІПАВА, палкоўніка ЯКУШЫНА, палкоўніка РЫБАКОВА, палкоўніка СМАЛАВІКА, палкоўніка КАЛУГІНА, палкоўніка ТІХАМІРАВА, палкоўніка ПАКАЕВАГА, палкоўніка ПУШКАРОВА, генерал-маёра авіяцыі БАЛАШОВА, генерал-маёра авіяцыі ЧЭМАДАНАВА, генерал-маёра авіяцыі ДРАНІНА, генерал-маёра авіяцыі НАБОКАВА, генерал-маёра авіяцыі ШЧЭРБАКОВА, генерал-маёра авіяцыі ШЫРОКАГА, генерал-маёра авіяцыі БРОЎКА, генерал-маёра авіяцыі КАРТАКОВА, генерал-маёра авіяцыі ГЛУШЭНКОВА, генерал-маёра авіяцыі БЛІНОВА, генерал-маёра авіяцыі МЕНЬШЫКАВА, генерал-маёра авіяцыі ЛЕБЕДЗЕВА, палкоўніка КАЖЭМЯКІНА; сапёры генерал-маёра інжынерных войск БЛАГАСЛАВАВА, палкоўніка КУРАВА, генерал-маёра інжынерных войск ШЫДКОГА, палкоўніка ТРЭЦЬЯКОВА, генерал-маёра інжынерных войск ВІТВІНІНА; сувязісты генерал-маёра войск сувязі БАРЗОВА, генерал-маёра войск сувязі НАВАРЧУКА, палкоўніка БАХІЛІНА, палкоўніка БАРЫСАВА, падпалкоўніка ПРОЦЭРАВА, палкоўніка ВАЛАДКЕВІЧА.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях за авалоданне горадам і крэпасцю ГДАНЬСК, прадставіць да прысваення найменавання «ГДАНЬСКІХ» і да ўзнагароджання ордэнамі.

Сёння, 30 сакавіка, у 22 гадзіны сталіца нашай Радзімы МАСКВА ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 2-га Беларускага фронта, у тым ліку танкістам Першай Польскай арміі генерал-лейтэнанта ПАПЛАЎСКАГА, якія авалодалі горадам і крэпасцю ГДАНЬСК,—дваццаццю артылерыйскімі залпамі з двухсот дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні АБ'ЯЎЛЯЮ ПАДЗЯКУ кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за вызваленне ГДАНЬСКА.

Вечная слава героям, паўшым у баях за свабоду і незалежнасць Совецкага Саюза і Польшчы!

Смерць нямецкім захопнікам!

30 сакавіка 1945 года
№ 319

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН.

ЗАГАД

Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

Камандуючаму войскамі 3-га Украінскага фронта
Маршалу Совецкага Саюза ТАЛБУХІНУ
Начальніку штаба фронта
Генерал-лейтэнанту ІВАНОВУ

Войскі 3-га УКРАІНСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне на захадзе ад возера БАЛАТОН, сёння, 30 сакавіка, авалодалі гарадамі—ЗАЛАЭГЕРСЕГ і КЕСТЭЛЬ.

Адначасова войскі фронта разам з войскамі балгарскай арміі прарвалі абарону праціўніка на поўдні ад возера БАЛАТОН і, прасунуўшыся ўперад да 30 кілометраў, авалодалі гарадамі НАДЗЬБАЙОМ, БЕГЕНЕ, МАРЦАЛІ і НАДЗЬЯТАД—моцнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў, якія прыкрываюць нафтавы раён НАДЗЬКАНІЖА.

У баях пры прарыве абароны немцаў і авалоданні ЗАЛАЭГЕРСЕГ, КЕСТЭЛЬ і другімі названымі гарадамі вызначыліся войскі генерал-палкоўніка ТРАФІМЕНКА, генерал-лейтэнанта ШАРОХІНА, балгарскай арміі генерал-лейтэнанта СТОЙЧЭВА, генерал-маёра войск сувязі БРАГІНА, генерал-маёра ВЕРХАЛОВІЧА, генерал-маёра СЕМЁНАВА, генерал-маёра КАЛЧУКА, генерал-маёра БЛАГАЛАТАВА, генерал-маёра КРАЎЦОВА, генерал-маёра АРЦЮШЭНКА, генерал-маёра БУНЯШЫНА, генерал-маёра ТРАЎНІКАВА, генерал-маёра ТОШЭВА, палкоўніка ДРЭМЕНКОВА, палкоўніка ГАРАБЕЦ, палкоўніка ХАДЖЫ ІВАНОВА, палкоўніка ХАХЛОВА, палкоўніка БУРЫКА, палкоўніка ЧЭБАТАРОВА, палкоўніка ПІСКУНОВА, палкоўніка ПЕТРУШЫНА, палкоўніка ШЧЭРБЕНКА, палкоўніка НАЙДЫШЭВА, палкоўніка ТАРАЛЕШКАВА, палкоўніка ХУБЕНАВА; артылерысты генерал-палкоўніка артылерыі НЕДЗЕЛІНА, генерал-маёра артылерыі БРЭЙДО, генерал-маёра артылерыі ЛЕБЕДЗЕВА, генерал-маёра артылерыі БАБРОЎНІКАВА, палкоўніка ПЕТРОВА, палкоўніка ФЁДАРАВА, палкоўніка ГОЦАКА, палкоўніка СІНІЦЫНА, палкоўніка ГУШЧЫНА, палкоўніка ПРЫСТРУЖАКА, палкоўніка МАРКАВА, палкоўніка ПАПОВА, палкоўніка ЗАГОРАВА, палкоўніка МІЛУШЭВА, падпалкоўніка НЕЧАЕВА, падпалкоўніка КАРОВІНА, падпалкоўніка СНЫЦІНА, падпалкоўніка ВЛАСЕНКА, падпалкоўніка ШПЕКА, маёра ХАДЖЫЕВА, маёра КУЗМЕНКА, капітана СІЛКІНА; танкісты генерал-маёра танкавых войск ПАВЕЛКІНА, генерал-маёра ГАВАРУНЕНКА, палкоўніка ЧУНІХІНА, палкоўніка ІНДЗЕЙКІНА, палкоўніка ГАРЧЫНСКАГА, палкоўніка ЛУК'ЯНАВА, палкоўніка СТЫЗІКА, падпалкоўніка ШЭЎЧЭНКА, падпалкоўніка САЎКІНА; лётчыкі генерал-палкоўніка авіяцыі СУДЗЕЦ, генерал-маёра авіяцыі БЕЛІЦКАГА, генерал-маёра авіяцыі КОРСАКАВА, генерал-маёра авіяцыі ЦІШЧЭНКА, палкоўніка ДЗЕМЕНЦЬЕВА, палкоўніка УЛЬЯНОЎСКАГА, палкоўніка НЕДАСЕКІНА; сапёры генерал-палкоўніка інжынерных войск КАТЛЯРА, генерал-маёра інжынерных войск ГАЛДАВІЧА, палкоўніка ПАЎЛЕНКА, палкоўніка ПАНІМАШ, маёра НОВІКАВА; сувязісты генерал-лейтэнанта войск сувязі КАРАЛЁВА, палкоўніка СТАРАЦЕТАВА, палкоўніка АГАФОНАВА, маёра КОРАНЬ.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях пры прарыве абароны немцаў і авалоданні ЗАЛАЭГЕРСЕГ, КЕСТЭЛЬ і другімі названымі гарадамі, прадставіць да ўзнагароджання ордэнамі.

Сёння, 30 сакавіка, у 23 гадзіны сталіца нашай Радзімы МАСКВА ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 3-га УКРАІНСКАГА фронта, у тым ліку балгарскай арміі генерал-лейтэнанта СТОЙЧЭВА, якія прарвалі абарону немцаў і авалодалі названымі гарадамі,—дваццаццю артылерыйскімі залпамі з двухсот дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні АБ'ЯЎЛЯЮ ПАДЗЯКУ кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях пры прарыве абароны немцаў і авалодалі пайменаванымі гарадамі.

Вечная слава героям, паўшым у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захопнікам!

30 сакавіка 1945 года.
№ 320.

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН.

УКАЗ

Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

Аб узнагароджанні Маршалаў Совецкага Саюза Конева І. С., Жукава Г. К. і Ракасоўскага К. К. ордэнам „Победа"

За ўмелае выкананне заданняў Вярхоўнага Галоўнакамандавання па кіраўніцтву баявымі аперацыямі вялікага маштаба, у выніку якіх дасягнуты выдатныя поспехі ў справе разгрому нямецка-фашысцкіх войск,—узнагародзіць

ОРДЭНАМ «ПОБЕДА»

Маршала Совецкага Саюза КОНЕВА Івана Сцепанавіча
Маршала Совецкага Саюза ЖУКАВА Георгія Канстанцінавіча
Маршала Совецкага Саюза РАКАСОЎСКАГА Канстанціна Канстанцінавіча.

Масква, Крэмль.
30 сакавіка 1945 года.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР *М. КАЛІНІН.*
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР *А. ГОРКІН.*

На барацьбу за высокі ўраджай!

Калгаснікі і калгасніцы сельгасарцелі імені Чырвоных партызан, Краснадарскага края, звярнуліся да ўсіх калгаснікаў і калгасніц, трактарыстаў і трактарыстак, аграномаў, механікаў і інжынераў, да ўсіх работнікаў сельскай гаспадаркі Совецкага Саюза з заклікам арганізаваць **усесаюзнае соцыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай 1945 г.**

Хлебаробы Кубані ў звароце, які апублікаван ва ўчарашнім нумары нашай газеты, заклікаюць совецкае сялянства да ўзорнай арганізацыі палявых работ, да правядзення сяўбы ў сціслыя тэрміны і так, як гэтага патрабуе перадавая агратэхніка.

Зварот кубанцаў, іх заклік прасякнут высокім пачуццём патрыятычнага абавязку перад Радзімай, благародным імкненнем зрабіць як мага больш для фронта, для канчатковай перамогі над ворагам.

«Наша калгаснае сялянства актыўна і з поўным усведамленнем свайго абавязку перад Радзімай садзейнічае Чырвонай Арміі ў дасягненні перамогі над ворагам» (СТАЛІН).

Калгас імені Чырвоных партызан, які выступіў ініцыятарам усесаюзнага соцыялістычнага спаборніцтва, перажыў змрочныя дні нямецкай акупацыі. За кароткі час пасля вызвалення ад немцаў ён дабіўся вялікіх поспехаў у аднаўленні ўсіх галін сваёй гаспадаркі. Для калгаснікаў і ўсяго працоўнага сялянства нашай рэспублікі, не так даўно вызвалепай ад нямецкага нашэства, гэта знамянальны факт.

У Беларусі, як і на Кубані і ў другіх вызваленых ад нямецкай акупацыі раёнах, адбываецца працэс аднаўлення сельскай гаспадаркі, ідзе напружаная, вялікая творчая праца па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў, МТС, па павышэнню ўраджайнасці, аднаўленню жывёлагадоўлі, расшырэнню пасеўных плошчаў. Перадавыя калгасы—імені Варашылава, Гомельскай вобласці, «КІМ»—на Палессі, «Чырвоны Бераг» у Аршанскім раёне і многія дзесяткі другіх сельгасарцелей рэспублікі заслужана заваявалі славу перадавікоў і далёка вядомы за межамі БССР.

Кубанскія калгаснікі расказваюць:

«Пасля вызвалення роднага краю ад нямецкіх разбойнікаў у нашым калгасе адноўлена: малочна-таварная, аўцагадоўчая, свінагадоўчая фермы і пасека, якія былі разбураны немцамі. Дзяржаўны план развіцця жывёлагадоўлі на 1944 год выканан па буйнай рагатай жывёле на 136 процантаў, па свінях—на 103 процанты, па авечках—на 107 процантаў, па конях—на 103 процанты.

У мінулым годзе мы вырасцілі і ўбралі добры ўраджай. Азімай пшаніцы з 523 гектараў мы знялі па 15,7 цэнтнера з гектара, ячменю яравога з 672 гектараў па 13 цэнтнераў...».

Калгаснікі арцелі імені Чырвоных партызан не толькі поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па абавязковых пастаўках, але здалі звыш гэтага, у фонд Чырвонай Арміі, 41 тысячу пудоў збожжа і многа іншых прадуктаў.

Дасягненні перадавікоў павінны быць прыкладам, мабілізуючым духоўныя і фізічныя сілы нашага сялянства на барацьбу за новыя поспехі, а соцыялістычнае спаборніцтва павінна паўсямесна стаць метадам, які дапаможа дабіцца высокага ўраджаю і ўзорнага правядзення ўсіх сельскагаспадарчых работ.

Галоўная задача партыйных, совецкіх арганізацый і зямельных органаў нашай рэспублікі ў галіне сельскай гаспадаркі заключаецца ў тым, каб у бліжэйшыя два—тры годы аднавіць даваенныя памеры пасеўных плошчаў, павысіць ураджайнасць і павялічыць валавы збор збожжа, бульбы і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў. Веснавая сяўба 1945 года з'яўляецца важнейшым этапам на шляху да ажыццяўлення гэтай задачы. Шырокае разгортванне соцыялістычнага спаборніцтва паміж абласцямі, раёнамі, калгасамі, соўгасамі, МТС, брыгадамі, звенямі з'яўляецца неабходнай умовай паспяховага правядзення сяўбы.

У гэтыя дні ў рэспубліцы праходзяць нарады перадавікоў сельскай гаспадаркі, сходы сялян у заходніх абласцях БССР. Адбываецца праверка выканання ўзятых абавязацельстваў па падрыхтоўцы да вясны, заключаюцца новыя дагаворы соцыялістычнага спаборніцтва.

Перадавікі сельскай гаспадаркі Мінскай вобласці, абмеркаваўшы пытанне падрыхтоўкі і правядзення сяўбы, узялі на сябе рад абавязацельстваў і выклікалі на соцыялістычнае спаборніцтва працаўнікоў сельскай гаспадаркі Бабруйскай вобласці. У соцыялістычнае спаборніцтва, якое ўсё шырэй і шырэй разгортваецца ў калгасах, соўгасах, МТС рэспублікі, уключаюцца і сяляне - аднаасобнікі заходніх абласцей БССР. Гэтымі днямі адбыліся многалюдныя сходы сялян у Брэсце і Пінску, якія ад імені ўсіх сялян сваіх абласцей узялі на сябе цэлы рад соцыялістычных абавязацельстваў. Сяляне Брэстчыны абавязаліся давесці пасеўную плошчу яравога кліна да ўзроўню 1940 года, павысіць ураджайнасць, правесці веснавую сяўбу ў сціслыя тэрміны і на высокім агратэхнічным узроўні.

Рэспубліка наша стаіць напярэдадні веснавой сяўбы. Праз некалькі дзён пачнецца масавы выхад у поле. І таму надзвычай важным з'яўляецца, каб голас кубанцаў, голас перадавікоў, дайшоў хутчэй ва ўсе куткі нашай рэспублікі і знайшоў гарачы водгук у беларускіх хлебаробаў.

Не павінна быць ні аднаго калгаса, соўгаса, ні адной сялянскай гаспадаркі, якія-б не сталі ў рады спаборнічаючых за высокі ўраджай. Таксама, як сэрцам сваім кожны з нас знаходзіцца разам з сынамі Радзімы, якія, не шкадуючы крыві і жыцця свайго, штурмуюць звярынае логава немцаў, таксама і справамі сваімі на палях працаўнікі сельскай гаспадаркі рэспублікі зробяць усё для таго, каб аказаць максімальную дапамогу нашай гераічнай Чырвонай Арміі.

У гэтыя дні неабходна правесці праверку і ўзаемаправерку гатоўнасці да сяўбы ўсіх калгасаў, МТС, соўгасаў, аднаасобных гаспадарак. Першы-ж выхад у поле павінен быць узорна арганізаван, усе дэталі павінны быць прадугледжаны, а ўсе дробныя непаладкі выпраўлены. Кожная брыгада, звяно, кожны калгаснік павінны дакладна ведаць сваё месца, свае заданні.

Задача партыйных, комсамольскіх і совецкіх арганізацый, абласнога і раённага друку—хутчэй давесці зварот кубанскіх хлебаробаў да калгасаў, да сяла, арганізаваць шырокае абмеркаванне яго, быць сапраўднымі арганізатарамі соцыялістычнага спаборніцтва за ўзорнае правядзенне веснавой сяўбы, за высокі ўраджай.

Вышэй сцяг соцыялістычнага спаборніцтва!

Ад Совецкага Інформбюро

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 30 САКАВІКА

Войскі 2-га БЕЛАРУСКАГА фронта завяршылі разгром Данцыгскай групы немцаў 30 сакавіка штурмам авалодалі горадам і крэпасцю ГДАНЬСК (ДАНЦЫГ)—важнейшым портам і першакласнай ваенна-марской базай немцаў на Балтыйскім моры.

Над ГДАНЬСКАМ узнят нацыянальны флаг Польскай дзяржавы.

У баях за горад ГДАНЬСК войскі фронта ўзялі ў палон 10.000 нямецкіх салдат і афіцэраў, а таксама захапілі наступныя трафеі: самалётаў—84, танкаў і самаходных гармат—140, палявых гармат—358, мінамётаў—566, кулямётаў—1.397, бронепаяздоў—15, падводных лодак—45, паравозаў—306, чыгуначных вагонаў — 6.675, суднаў рознага танажа — 151, складаў з узбраеннем, боепрыпасамі і харчаваннем—214. Праціўнік страціў толькі забітымі больш 39.000 салдат і афіцэраў.

У раёнах ГЛОГАУ і БРЭСЛАУ прадаўжаліся баі па знішчэнню акружаных войск праціўніка.

Войскі 2-га УКРАІНСКАГА фронта, перайшоўшы ў наступленне, фарсіравалі рэкі ГРОН і НІТРА, прарвалі абарону праціўніка па заходніх берагах гэтых рэк і, прасунуўшыся ўперад на 50 кіламетраў, авалодалі гарадамі КАМАРНО, НОВЫ ЗАМКІ, ШУРАНЫ, КОМ'ЯТЫЦЭ, ВРАБЛЕ—моцнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на Брацілаўскім напрамку, а таксама занялі больш 450 другіх населеных пунктаў, у тым ліку буйныя населеныя пункты НОВА БАНЯ, ВАЛКОЎЦЭ, ЛОК, ФАРНАД, СОЛДЫНЫ, КЕБЕЛКУТ, МУЖЛА, ТАПАЛЬЧАНКІ, МЛЫНЯНСКЕ-ТЕСАРЫ, ДВОРЫ, ПЕРБЕШЭ, МАРСЕЛОВА, ЕШКОВА-НОВА-ВЕС, КОВАРЦЭ, ОПОНІЦЭ, ЖЫРАНЫ, ІВАНКА, ЦАБАЙ-ЧАПОР, УРМІН, ТАРДОШКЕД, СЕЛІЦЭ, СЛОВАЦКІ МЕДЭР, АНДОД, НАСВАД і чыгуначныя станцыі ТАПАЛЬЧАНКІ, ЗЛАТЭ,-МОРАЎЦЭ, МЛЫНЯНСКЕ-ТЕСАРЫ, СВЯТОЙ МІХАЛ, ІВАНКА, ТАРДОШКЕД. Адначасова войскі фронта, наступаючы па паўднёваму берагу ДУНАЯ, занялі больш 30 населеных пунктаў і сярод іх НАДЗЬБАЙЧ, АЛЬШОВАМОШ, БАЧА, ІКРЭНІ, РАБА-ПАТОНА, ЭНЕШЭ, КОНІ, БЕЗІ, ТАРНО-КРЭТЫ, БАРБАЧ. У баях за 29 сакавіка войскі фронта ўзялі ў палон больш 1.000 салдат і афіцэраў праціўніка.

Войскі 3-га УКРАІНСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне на захадзе ад возера БАЛАТОН, 30 сакавіка авалодалі гарадамі ЗАЛАЭГЕРСЕГ і КЕСТЭЛЬ, а таксама занялі больш 150 другіх населеных пунктаў, у тым ліку ДЭМЕНЦЕР, ФЕЛЬШЭОСКА, АНДРАШФА, КАРАТФЕЛЬД, БАГОД, НАГІКАПОРНАК, НЕМЕТФАЛУ.

Адначасова войскі фронта, разам з войскамі балгарскай арміі, прарвалі абарону праціўніка на поўдні ад возера БАЛАТОН і, прасунуўшыся ўперад да 30 кіламетраў, авалодалі гарадамі НАДЗЬБАЙОМ, БЕГЕНЕ, МАРЦАЛІ і НАДЗЬЯТАД — моцнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў, якія прыкрываюць нафтавы раён НАДЗЬКАНІЖА, а таксама занялі больш 100 другіх населеных пунктаў, у тым ліку буйныя населеныя пункты КЕСТОЎ, БЕРЭНЬ, ВЕРШ, КЕТЭЛЬ, МЕСТЭГНЕ, ТАПШОНЬ, НЕМЕШДЗЕД, ВЕЙСЕ, ФЕЛШЭШЭГЕШД, ШАМАДЗЬСОБ, БОЛХАШ, ТАРАНІ, БЕЛАВАР і чыгуначныя станцыі КЕРЭСТУР, КЕТЭЛЬ, ДЗЬЕТАПУСТА, МЕСТЭГНЕ, АЛШОШЭГЕШД, ШАМАДЗЬСОБ, ВІЗВАР.

Войскі фронта на поўначы ад горада КЕСЕГ перасеклі аўстрыйскую граніцу і ўступілі на тэрыторыю Аўстрыі.

На другіх участках фронта — пошукі разведчыкаў і ў радзе пунктаў баі мясцовага значэння.

За 29 сакавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 78 нямецкіх танкаў і самаходных гармат. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 8 самалётаў праціўніка.

НАЛЁТ НАШАЙ АВІЯЦЫІ НА ГОРАД ВІНЕР НОЙШТАДТ У АЎСТРЫІ

У ноч на 30 сакавіка нашы цяжкія бамбардыроўшчыкі нанеслі ўдар па ваенных аб'ектах праціўніка ў горадзе Вінер Нойштадт у Аўстрыі. У выніку бамбардыроўкі ўзніклі пажары, якія суправаджаліся выбухамі вялікай сілы.

* * *

Войскі 2-га Беларускага фронта сёння штурмам авалодалі горадам і крэпасцю Гданьск (Данцыг). Праціўнік падрыхтаваў горад да доўгай абароны. Подступы да яго прыкрываў магутны ўмацаваны раён, які складаецца з трох абарончых рубяжоў. Усе населеныя пункты ў гэтым раёне немцыператварылі ў апорныя пункты і прыстасавалі іх для кругавой абароны. На ўскраінах горада былі збудаваны жалезабетонныя доты, казематы для палявой і берагавой артылерыі і падземныя сховішчы для асабовага састава. Каменныя будынкі прыстасаваны пад агнявыя кропкі і злучаны паміж сабой хадамі зносін. На вуліцах горада гітлераўцы адрылі траншэі і пабудавалі загароды, за якімі былі ўстаноўлены гарматы для страляньбы прамой наводкай. Горад абаранялі буйныя сілы нямецкіх войск, падтрыманыя агнём артылерыі ваенных караблёў. Палонныя паведамілі, што Гітлер аддаў сваім войскам найстражэйшы загад абараняць Данцыг да апошняга салдата. Апіраючыся на крэпасць і вельмі выгадныя пазіцыі, немцы разлічвалі надоўга скаваць пад Гданьскам буйныя сілы Чырвонай Арміі. Аднак, планы гітлераўцаў былі сарваны ўмелымі і рашучымі дзеяннямі совецкіх войск. Нашы пехацінцы і танкісты, падтрыманыя артылерыяй і авіяцыяй, наступаючы з поўдня, захада і поўначы, прарвалі абарону немцаў і ачышчалі ад варожых войск квартал за кварталам. Сёння совецкія часці, зламаўшы супраціўленне праціўніка, авалодалі ўсходняй часцю горада. Занят апошні аплот абароны немцаў у Гданьску—бастыёны ў паўднёва-заходняй частцы горада. Такім чынам, войскі 2-га Беларускага фронта за кароткі час сакрушылі магутную варожую абарону, разграмілі буйную групу нямецкіх войск і авалодалі Гданьскам—важнейшым портам і першакласнай ваенна-марской базай немцаў на Балтыйскім моры.

У баях за Гданьск немцы страцілі палоннымі і забітымі больш 49.000 салдат і афіцэраў. Знішчана многа танкаў, сотні гармат, мінамётаў і іншага ўзбраення праціўніка.

* * *

Войскі 2-га Украінскага фронта перайшлі ў наступленне на Брацілаўскім напрамку. Некалькі дзён назад совецкія перадавыя атрады, пад прыкрыццём артылерыйскага агню, пераправіліся праз раку Грон і імклівай атакай занялі два апорныя пункты на яе заходнім беразе. За ракой завязаліся жорсткія баі. Немцы, прабуючы адкінуць нашы перадавыя атрады, не раз пераходзілі ў контратакі. Тым часам па пераправах, наведзеных нашымі інжынернымі падраздзяленнямі праз Грон, пераправіліся асноўныя совецкія сілы. Пасля артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі нашы войскі перайшлі ў наступленне і прарвалі доўгачасовую і глыбока эшаланіраваную абарону немцаў. Праціўнік, падцягнуўшы з тылу рэзервы, аказваў упорнае супраціўленне. Адкідваючы немцаў, совецкія часці авалодалі горадам Врабле. Развіваючы поспех, нашы войскі на шырокім фронце выйшлі на раку Нітра і ў радзе месц з ходу фарсіравалі гэтую сур'ёзную водную перашкоду. Совецкія рухомыя злучэнні ўварваліся на вуліцы горада Новы Замкі і пасля ўпорнага бою авалодалі ім. Совецкія пехацінцы, пры падтрымцы караблёў Дунайскай флатыліі, імклівым ударам занялі таксама горад Камарно—буйны прамысловы цэнтр Чэхаславакіі. У горадзе ёсць суднабудаўнічыя верфі, нафтаперагонны, машынабудаўнічы, спарадны і іншыя заводы. Нашымі байцамі захоплены вялікія трафеі.

* * *

Войскі 3-га Украінскага фронта прадаўжалі паспяховае наступленне. Совецкія часці прасунуліся ўздоўж ракі Зала на 20 кіламетраў і выбілі немцаў з горада Залаэгерсег—вузла чыгунак. Гітлераўцы прадпрынялі контратаку, але былі адкінуты з вялікімі для іх стратамі. Другія нашы часці авалодалі горадам Кестэль і тым самым ачысцілі ад праціўніка паўночна-заходняе ўзбярэжжа возера Балатон. У баях за дзень знішчана звыш 3.000 нямецкіх салдат і афіцэраў. Захоплена ў немцаў 30 самалётаў, 31 танк, 13 бронетранспарцёраў, 47 палявых гармат, многа мінамётаў, кулямётаў і склады з ваеннай маёмасцю. Узята вялікая колькасць палонных.

НА ТАНКАВУЮ КАЛОНУ „ЛЯСНІК БЕЛАРУСІ“

МАГІЛЕЎ, 30 сакавіка. (БЕЛТА). Натхнёныя перамогамі Чырвонай Арміі, рабочыя і служачыя лясных гаспадарак вобласці арганізавалі збор сродкаў на будаўніцтва танкавай калоны «Ляснік Беларусі». Зараз на ўсіх прадпрыемствах і ў гаспадарках тэрытарыяльнага Упраўлення лесаахвовы і лесанасаджэнняў актыўна праходзіць збор сродкаў. Усяго па вобласці ўжо сабрана на танкавую калону звыш 160 тысяч рублёў.

УКАЗ

Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР

Аб узнагароджанні многадзетных мацярэй ордэнамі „Материнская слава“ і медалямі „Медаль материнства“

На падставе Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 18 жніўня 1944 года ўзнагародзіць ад імені Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР:

МАЦЯРЭЙ, ЯКІЯ НАРАДЗІЛІ І ВЫХАВАЛІ ДЗЕВЯЦЬ ДЗЯЦЕЙ ОРДЭНАМ «МАТЕРИНСКАЯ СЛАВА» І СТУПЕНІ

1. **Латыш** Елену Венедзіктаўну—калгасніцу калгаса «Ленінскі завет» Кузевіцкага сельсовета, Лагойскага раёна, Мінскай вобласці.

2. **Ломскую** Марыю Леапаўну—хатнюю гаспадыню вёскі Мельнікі Кругавіцкага сельсовета, Ганцэвіцкага раёна, Пінскай вобласці.

3. **Пячонік** Екацярыну Міхайлаўну—хатнюю гаспадыню горада Давід-Гарадок Пінскай вобласці.

4. **Пратасавіцкую** Агафію Фёдараўну—хатнюю гаспадыню вёскі Калауравічы Біжэрэвіцкага сельсовета, Пінскага раёна, Пінскай вобласці.

5. **Фрыдрых-Мурашка** Іраіду Вячаслаўну—старшага інспектара аддзела па дзяржданамогах многадзетным і адзінокім мацерам выканкома Мінскага горсовета.

6. **Шкілёнак** Марыю Андрэеўну—калгасніцу калгаса «Радзіма» Лагойскага сельсовета, Лагойскага раёна, Мінскай вобласці.

МАЦЯРЭЙ, ЯКІЯ НАРАДЗІЛІ І ВЫХАВАЛІ ВОСЕМ ДЗЯЦЕЙ ОРДЭНАМ «МАТЕРИНСКАЯ СЛАВА» ІІ СТУПЕНІ

1. **Банько** Анну Васільеўну—хатнюю гаспадыню вёскі Бакінічы Дубновіцкага сельсовета, Пінскага раёна, Пінскай вобласці.

2. **Бялько** Надзею Пятроўну—калгасніцу калгаса «Краіна Советаў», Кузевіцкага сельсовета, Лагойскага раёна, Мінскай вобласці.

3. **Гуляеву** Степаніду Віктараўну—хатнюю гаспадыню горада Пінска.

4. **Зялёнка** Надзею Фамінічну—хатнюю гаспадыню вёскі Ганцэвічы Ганцэвіцкага сельсовета, Ганцэвіцкага раёна, Пінскай вобласці.

5. **Зужо** Еву Пятроўну—хатнюю гаспадыню вёскі Рудовік Стаўскага сельсовета, Пінскага раёна, Пінскай вобласці.

6. **Коўб** Аляксандру Аксенцьеўну—хатнюю гаспадыню вёскі Лемяшэвічы Лемяшэвіцкага сельсовета, Пінскага раёна, Пінскай вобласці.

7. **Любчык** Ольгу Міхайлаўну—хатнюю гаспадыню горпасёлка Целеханы Пінскай вобласці.

8. **Матусевіч** Анну Міхайлаўну—хатнюю гаспадыню горада Давід-Гарадок Пінскай вобласці.

9. **Мельнічук** Пелагею Максімаўну—хатнюю гаспадыню вёскі Кнубава Плешчыцкага сельсовета, Пінскага раёна, Пінскай вобласці.

10. **Мытнік** Антаніну Нікаласўну—калгасніцу калгаса «8-е сакавіка» Лагойскага сельсовета, Лагойскага раёна, Мінскай вобласці.

11. **Пась** Анну Астапаўну—хатнюю гаспадыню вёскі Ласіцы Ласіцкага сельсовета, Пінскага раёна, Пінскай вобласці.

12. **Пілевіч** Марыю Майсееўну—хатнюю гаспадыню горада Пінска.

13. **Санько** Пелагею Дзям'янаўну—хатнюю гаспадыню вёскі Кнубава Плешчыцкага сельсовета, Пінскага раёна, Пінскай вобласці.

МАЦЯРЭЙ, ЯКІЯ НАРАДЗІЛІ І ВЫХАВАЛІ СЕМ ДЗЯЦЕЙ ОРДЭНАМ «МАТЕРИНСКАЯ СЛАВА» ІІІ СТУПЕНІ

1. **Барбашэвіч** Фёклу Максімаўну—хатнюю гаспадыню вёскі Макаў Люсінскага сельсовета, Ганцэвіцкага раёна, Пінскай вобласці.

2. **Бут-Гусаім** Марыю Іосіфаўну—хатнюю гаспадыню горада Пінска.

3. **Бінкевіч** Аляксандру Іванаўну—хатнюю гаспадыню вёскі Целеханы Целеханскага сельсовета, Целеханскага раёна, Пінскай вобласці.

4. **Зялёнка** Дамініку Міхайлаўну—хатнюю гаспадыню вёскі Ганцэвічы Ганцэвіцкага сельсовета, Ганцэвіцкага раёна, Пінскай вобласці.

5. **Занько** Агафію Грыгор'еўну—хатнюю гаспадыню вёскі Люсіна Люсінскага сельсовета, Ганцэвіцкага раёна, Пінскай вобласці.

6. **Латышэвіч** Марыю Георгіеўну—хатнюю гаспадыню вёскі Рэчкі Рэчкаўскага сельсовета, Целеханскага раёна, Пінскай вобласці.

7. **Латышэвіч** Усцінью Васільеўну—хатнюю гаспадыню вёскі Целеханы Целеханскага сельсовета, Целеханскага раёна, Пінскай вобласці.

8. **Мрачкоўскую** Марыю Вікенцьеўну—хатнюю гаспадыню горада Мінска.

9. **Мялік** Яўгенію Антонаўну—хатнюю гаспадыню вёскі Рэчкі Рэчкаўскага сельсовета, Целеханскага раёна, Пінскай вобласці.

10. **Пакроўскую** Варвару Кузьмінічну—хатнюю гаспадыню горада Пінска.

11. **Чыгір** Таццяну Нікалаеўну—хатнюю гаспадыню гарадскога пасёлка Ганцэвічы Ганцэвіцкага раёна, Пінскай вобласці.

МАЦЯРЭЙ, ЯКІЯ НАРАДЗІЛІ І ВЫХАВАЛІ ШЭСЦЬ ДЗЯЦЕЙ МЕДАЛЕМ «МЕДАЛЬ МАТЕРИНСТВА» І СТУПЕНІ

1. **Бесан** Соф'ю Фёдараўну—хатнюю гаспадыню горада Давід-Гарадок Пінскай вобласці.

2. **Галавач** Марыю Грыгор'еўну—хатнюю гаспадыню вёскі Целеханы Целеханскага сельсовета, Целеханскага раёна, Пінскай вобласці.

3. **Крэсік** Надзею Паўлаўну—хатнюю гаспадыню горада Мінска.

МАЦЯРЭЙ, ЯКІЯ НАРАДЗІЛІ І ВЫХАВАЛІ ПЯЦЬ ДЗЯЦЕЙ МЕДАЛЕМ «МЕДАЛЬ МАТЕРИНСТВА» ІІ СТУПЕНІ

1. **Крым** Анну Фёдараўну—хатнюю гаспадыню горада Давід-Гарадок Пінскай вобласці.

2. **Лыбко** Марыю Іванаўну—хатнюю гаспадыню горада Давід-Гарадок Пінскай вобласці.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР **Н. НАТАЛЕВІЧ.**

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР **Л. ПАПКОЎ.**

26 сакавіка 1945 года
г. Мінск.

КІНО

„РОДНЫЯ ПАЛІ“

Новы кінофільм «Родныя палі» (аўтар сцэнарыя М. Папава, пастаноўшчыкі Б. Бабачкін і А. Басулаеў. Вытворчасць кінастудыі «Мосфільм»)—гэта першы фільм пра калгасную вёску ваеннага часу, пра ее людзей, якія самаадданна працуюць на родных палях, забяспечваюць хлебам краіну, армію, дапамагаюць франтавікам — сваім мужам, братам і сынам знішчыць ворага.

У фільме праўдзіва, пераканаўча і хвалюючы расказваецца аб звычайных падзеях, якія адбываюцца ў калгасе. Людзі атрымліваюць з фронта пісьмы: радасныя—аб узнагароджанні блізкіх, сумныя—аб гібелі родных. Людзі плачуць і смяюцца, сумуюць і спяваюць. Дзяўчаты едуць на курсы трактарыстаў. У калгас прыбываюць эвакуіраваныя смаленскія калгасніцы. Яны самааддана працуюць, але мараць аб звароце на радзіму.

У зімовую халодную ноч людзям не спіцца. Кожны думае аб тым, што немцы блізка ад Масквы. І брыгада спешна грузіць на машыны хлеб для фронта, барадаты калгаснік валіць валёнкі для воінаў Чырвонай Арміі. А вось старшыня калгаса Іван Выбарнаў. Яго сыны на вайне. Сам ён, былы ўдзельнік грамадзянскай вайны, не раз ездзіў у райком і прасіўся на фронт. Але просьбы яго не задаволілі. Ён патрэбны тут. У калгасе мала рабочай сілы. Тут асталіся жанчыны, старыя, дзеці. Перамагаючы вялікія цяжкасці, яны сеюць, жнуць, малоцяць.

У карціне адсутнічае цэльная сюжэтная лінія. Але асобныя эпізоды, штрыхі, цесна пераплеценыя паміж сабой, ствараюць малюнак вялікай жыццёвай сілы, які выражае патрыятызм калгаснікаў, іх любоў да радзімы, неадрыўнасць тылу ад фронта. А канкрэтныя справы раскрываюць характар герояў.

У цэнтры карціны стаіць галоўны яе герой—старшыня передавога Быкаўскага калгаса Іван Выбарнаў, ролю якога надзвычай удала выконвае народны артыст РСФСР, лаурэат Сталінскай прэміі Барыс Бабачкін. Выбарнаў — гэта камандзір на маленькім участку вялікага фронта. Праўда, ён часам дапускае памылкі, нарушае калгасную дэмакратыю. Але ўсе яго рашэнні падпарадкаваны аднаму жаданню—дапамагчы фронту, дапамагчы сваёй краіне.

Ідзе шумны калгасны сход. Калгаснікі выказваюць сваё нездаволенне учынкам старшыні, які самачынна ўгнаў коней у суседні адстаючы Іванаўскі калгас. Выбарнаў не апраўдваецца, ён разумее, што зрабіў няправільна. Трэба было параіцца з калгаснікамі. Але ў гарачыя дні пасеўнай кампаніі цяжка было склікаць сход. А дапамагчы суседзям абавязкова трэба, бо, калі яны не засеюць свой клін, усёй краіне будуць нанесены страты.

«Можа я памыліўся? Можа не з быкаўцамі справу маю? Можа нас дарма ў газеце друкуюць?!»—усхвалявана гаворыць старшыня, разварачваючы нумар раённай [га]зеты. У газеце змешчаны партрэты [...]шых быкаўскіх калгаснікаў. Газета [...]ходзіць з рук у рукі. Усе задаволены. Удзельнікі схода прачыталі ў газеце, Быкаўскі калгас унёс у фонд абароны [...] тысяч рублёў і 50 цэнтнераў хлеба. «З[...] значыць, нікога не пытаючы, рашыў [...]біста?» — пасыпаліся папрокі. Зноў [...]гублены старшыня моўчкі сядзіць за [...]лом. Ён улічыць сваю памылку. [...] калгаснікі не толькі папрокамі імкн[...] направіць свайго старшыню. Яны [кан]крэтнымі справамі даказваюць свой [пат]рыятызм, сваю вялікую любоў да Рад[...]

— Выходзіць, ацаніў нас старшын[я] [...] сорак тысяч рублёў і трыста пудоў [хле]ба, — гаворыць дзед Мошкін. — А [...] паглядзім! Пішы, Маруся: ад Мошкіна [...]хіна Сямёнавіча грашыма дзесяць ты[...] хлеба трыццаць пудоў...

Прыкладу Мошкіна следуюць д[...] калгаснікі. Актыўна спаборнічаючы, [...]сяць яны грошы, хлеб у фонд абар[...] Іван Выбарнаў апошнім уносіць 100 [ты]сяч рублёў. Рашаюць паслаць тэлег[...] таварышу Сталіну.

Старшыня калгаса Выбарнаў — ч[ала]век з моцным, валявым характарам. [...] заўсёды ўдаецца ўнушыць сялянам, [...] толькі ў калгасе, толькі калектывам [...] на паспяхова справіцца з усімі цяжка[...]мі, якія выкліканы вайной. Ён уваход[...] ва ўсе дэталі калгаснага жыцця, клап[...]ца пра кожнага члена арцелі, перажы[...] імі і гора, і радасць.

Цікавы і каларытны вобраз ста[...] калгасніка Мошкіна стварыў заслу[...] артыст РСФСР, лаурэат Сталінскай п[...] В. Ванін. Мошкін—гэта былы салдат [...]скай арміі, з вялікім жыццёвым вопы[...] мудры і разумны. Ён, як і ўвесь нар[...] самы цяжкі для краіны час верыць, [...] немца знішчаць. Успамінаючы вёску [...]нёў-Майдан, ён гаворыць:

— Назва Майдан — гэта з стара[...] [...]пяга часу асталося, ці то татары, [...] туркі ахрысцілі. А зараз дзе яны? А [...] стаім і вечна стаяць будзем. А інакш [...] Без Расіі і свет скончыцца. А немец [...] дзе, падавіцца...

Таксама добра запамінаюцца во[...]зы людзей совецкай вёскі, ствара[...] артыстамі Н. Нікіцінай (Маруся Цюн[...]ва), А. Зуевай (старуха з забабонамі [...] Бугорная), А. Елісеевым (Ванюшка).

У фільме па-майстэрску, красачна [...]люстравана прырода. Пакрытыя інеем [...]вы, бялюткі снег, дарога, якая ўхо[...] у даль, і калгасныя дамы з кветкамі [...] вокнамі—усё гэта так блізка і міла с[...]

«Родныя палі»—фільм, які са здав[...]неннем прагледзіць і высока ацэніць [...]дач.

С. СВІРЫДА.

Ваенныя дзеянні ў Заходняй Еўропе

ЛОНДАН, 30 сакавіка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, з меркаванняў бяспекі паведамленні аб аперацыях, якія развіваюцца на фронце войск фельдмаршала Мантгомеры, па-ранейшаму не публікуюцца. У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца толькі, што на поўначы ад Рура войскі саюзнікаў прадаўжалі пад пакровам цемнаты развіваць паспяховае наступленне з прадмостнага ўмацавання ля Рэйна. Некаторыя бронетанкавыя часці прасунуліся больш чым на 16 кіламетраў.

У Эмерыхе прадаўжаюцца жорсткія баі. Бронетанкавыя часці, якія наступаюць на ўсходзе і паўднёвым усходзе ад Рура, дасягнулі пунктаў на лініі, што ідзе прыблізна ад Падэрборна на поўначы да [А]фенбурга—на поўдні. На поўдні ад Па[дэр]борна ад праціўніка ачышчана нека[...] пунктаў. У паведамленні штаба па[...]джаецца заняцце Марбурга і ачышч[...] ад праціўніка раду пунктаў, у тым [...] Бад-Наугейма і Франкфурта-на-Майне.

На ўсходзе ад Дармштадта войскі с[...]нікаў выйшлі да ракі Майн на 19-[...]метравым участку і ўтрымліваюць ус[...] бераг ракі на працягу 13 кіломе[...] на ўсход ад Ашафенбурга. У гэтым р[...] ўмацнілася супраціўленне праціўніка, [...] вядзе барацьбу з падрыхтаваных пазі[...]

28 сакавіка войскі саюзнікаў у[...] 18.719 палонных.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ КАПІТУЛЯЦЫІ МАНГЕЙМА

ЛОНДАН, 29 сакавіка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае затрыманае дастаўкай паведамленне свайго спецыяльнага карэспандэнта, які знаходзіцца з войскамі 7-й амерыканскай арміі ў Мангейме, аб ака[...]насцях, пры якіх быў заняты Мангейм—[...]ны прамысловы прырэйнскі горад, што [...] ходзіцца супроць Людвігсхафена.

Мангейм, піша карэспандэнт, быў [...] амерыканскай 44-й пяхотнай дывізіі па[...] лефону. Амерыканскія часці, прасоўва[...]ся ў паўночным напрамку, ачышчалі [...] вуліцу за вуліцай, калі амерыканскі са[...] пачуў у адной з устаноў тэлефонны [...]нок. Ён зняў трубку і пачуў нервовы го[...] які заявіў: «Я з'яўляюся адным з гарад[...] чыноўнікаў. Спыніце, калі ласка, страл[...] таму што ў Мангейме няма больш ня[...]кіх салдат».

Праз некалькі хвілін бургомістр го[...] паўтарыў па тэлефону заяву чыноўні[...] здаў горад амерыканцам. Амерыканскі [...]цэр сказаў яму аддаць загад аб тым, [...] былі вывешаны белыя флагі. Праз нека[...] хвілін белыя флагі развяваліся па ўс[...] Мангейму—першаму гораду ў свеце, [...] здаўся па тэлефону.

ДЗЕЯННІ АВІЯЦЫІ САЮЗНІКАЎ

ЛОНДАН, 30 сакавіка. (ТАСС). Як п[е]дае агенцтва Рэйтэр, каля 1.400 амеры[...]скіх цяжкіх бамбардыроўшчыкаў у супр[а]джэнні прыкладна 900 знішчальнікаў [...] білі сёння налёт на ваенныя аб'екты ў [...]мене, Гамбургу і Вільгельмсхафене.

У ноч на 30 сакавіка авіяцыя саюзні[...] падвергла бамбардыроўцы Берлін і аб'е[...] у Паўночна-Заходняй Германіі.

Адказны рэдактар **В. САМУЦІН.**

Сёння ў кіно:

Кіно-тэатр «Радзіма»—«Падкідыш», [...]цячы—«Сямёра смелых», «Першы»—«Дж[...]глі» (для школьнікаў), «Родныя палі» [...] дарослых), «Беларусь» — «Чапаеў» [...] школьнікаў), «Дзяўчына спяшаецца на с[...]канне» (для дарослых).

ЛІКВІДАЦЫЯ ЎСХОДНЕ-ПРУСКАЙ ГРУПЫ НЕМЦАЎ НА ПАЎДНЁВЫМ ЗАХАДЗЕ АД КЕНІГСБЕРГА

Жалезнае поўкальцо нашых войск шчыльна ахапіла тэрыторыю Усходняй Прусіі, адмежаваную з поўначы ракой Прэгель, з захада — узбярэжжам заліва Фрыш Гаф, з поўдня і ўсхода — паласой доўгачасовых умацаванняў, якія праходзілі ўздоўж рэк Пасарге і Але.

Гітлераўскае камандаванне лічыла, што магутныя ўмацаванні, пабудаваныя па апошняму слову фартыфікацыйнай тэхнікі, надоўга затрымаюць наступленне нашых войск. Афіцэрам і салдатам гарнізонаў апорных пунктаў было загадана любой цаной адстойваць займаемыя пазіцыі, не лічачыся ні з якімі стратамі.

У пачатку лютага совецкія часці падышлі да Хайльсбергскага ўмацаванага раёна. Гэтая магутная абарончая паласа, пабудаваная з жалезабетона, пачала ствараецца яшчэ ў 1932—1936 годах. У 1944 годзе было пачата будаўніцтва новай Хайльсбергскай умацаванай паласы, якая знаходзілася ўперадзе старой лініі абароны.

Населеныя пункты, якія знаходзіліся непасрэдна ў самой умацаванай паласе, былі ператвораны ў моцныя апорныя пункты. Уся тэрыторыя Усходняй Прусіі прадстаўляла з сябе велізарную крэпасць, насычаную не толькі рознастайнымі інжынернымі збудаваннямі, але і вельмі вялікай колькасцю артылерыйскіх і мінамётных батарэй. Усходне-пруская група нямецкіх войск на паўднёвым захадзе ад Кенігсберга мела таксама моцныя танкавыя рэзервы.

Нямецкае камандаванне было абсалютна ўпэўнена, што абарончая сістэма ва Усходняй Прусіі ніколі не будзе пераадолена совецкімі войскамі. Аднак разлікі гітлераўцаў не апраўдаліся.

У разгарнуўшайся бітве войскі 3-га Беларускага фронта пераадольвалі магутныя абарончыя збудаванні, масіраваны агонь артылерыі, няспынныя контратакі танкавых груп праціўніка і авалодвалі адным апорным пунктам за другім.

Асабліва жорсткія баі ішлі ў паўднёвай частцы ўмацаванага раёна, найбольш насычанай дотамі. Совецкія войскі, якія наступалі з усхода і паўднёвага ўсхода, прарваліся ў глыб умацаванага раёна. Шматлікія апорныя пункты аказаліся ў руках нашых часцей. Кальцо акружэння сціскалася ўсё тужэй і тужэй.

Наносячы вялікія страты праціўніку як у тэхніцы, так і ў жывой сіле, часці Чырвонай Арміі разразалі варожыя дывізіі на асобныя часткі і знішчалі іх.

13 сакавіка пачалося рашучае наступленне нашых войск. Пасля кароткай артылерыйскай падрыхтоўкі совецкія пехацінцы, танкісты і кавалерысты атакавалі пазіцыі праціўніка на ўсім фронце. Пераадольваючы ўпорнае супраціўленне ворага, нашы злучэнні за першы дзень баёў прасунуліся ўперад на некалькі кіламетраў.

На радзе ўчасткаў немцы прадпрымалі жорсткія контратакі. Выключна неспрыяючае надвор'е—нізкая воблачнасць і густы туман—не далі магчымасці шырока скарыстаць нашу авіяцыю. Совецкія атрады браніраваных машын з дэсантамі аўтаматчыкаў магутнымі ўдарамі пракладвалі сабе шлях да мора. На працягу 5 дзён наступальных баёў яны прасунуліся амаль на 20 кіламетраў і авалодалі вялікай колькасцю населеных пунктаў, у тым ліку важным вузлом дарог на ўзбярэжжы заліва Фрыш Гаф горадам Брандэнбург.

У другой палавіне сакавіка палепшылася надвор'е, і ў сувязі з гэтым больш эфектыўна пачалі дзейнічаць нашы лётчыкі. Магутны ўдар па абароне праціўніка нанесла совецкая авіяцыя 18 сакавіка. Увесь дзень чуліся разрывы нашых бомб на тэрыторыі праціўніка. Удар з паветра падрыхтаваў далейшыя поспехі нашых войск. За два наступныя дні часці Чырвонай Арміі прасунуліся на 6—12 кіламетраў і 20 сакавіка авалодалі важным вузлом чыгунак і шасейных дарог—горадам Браунсберг. У гэты дзень было захоплена многа танкаў, самаходных і палявых гармат, сотні кулямётаў, тысячы аўтаматаў, узята многа палонных.

Падзенне Браунсберга дазволіла войскам 3-га Беларускага фронта развіваць наступленне непасрэдна на ўзбярэжжы заліва Фрыш Гаф, куды і былі накіраваны ўдары нашай авіяцыі і артылерыі.

29 сакавіка войскі 3-га Беларускага фронта завяршылі ліквідацыю акружанай усходне-прускай групы нямецкіх войск на паўднёвым захадзе ад Кенігсберга. За час баёў з 13 па 29 сакавіка немцы страцілі 80.000 сваіх салдат і афіцэраў забітымі. Войскі фронта захапілі за гэты час звыш 50.000 палонных, 605 танкаў і самаходных гармат, больш 3.500 палявых гармат.

Палкоўнік **А. ВАСІЛЬЕЎ.**

3-ці Беларускі фронт,
29 сакавіка.
(Спец. кар. ТАСС).

АТ28707 АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: г. Мінск, вул. Пушкіна, 55, 3-ці паверх. Тэлефоны: Адказнага рэдактара—149, Адказнага сакратара—150.